После подписания Рижского мирного договора в 1921 г. граница прошла в непосредственной близости от Полоцка, местами в 25 – 30 км от города. Пограничное положение Полоцкого уезда оказало существенное влияние на деятельность милиции. С 1921 г. первоочередными задачами стали: кадровый состав и повышение уровня материального обеспечения сотрудников милиции. В структуру Управления полоцкой уездной милиции входили: адресный стол, хозяйственный отдел, отделение уголовного розыска, секретариат. Отличительной чертой организационно-структурного построения милиции было наличие в ее штате специальных подразделений, которые занимались политико-воспитательной работой. Работа по повышению образовательного уровня милиционеров была возложена на политсекретариат, который был создан при полоцкой милиции в апреле 1921 г. [13, л 140].

Таким образом, в 1918 – 1920 гг. происходило постепенное оформление аппарата советской милиции в Полоцком уезде, который имел ряд особенностей, связанных с немецкой и польской оккупацией. Прифронтовое положение накладывало существенный отпечаток на ее деятельность. На начальном этапе становления Полоцкая милиция выступала как организация, сочетавшая в себе государственные и общественные черты. Она не имела четкой структуры и формировалась преимущественно на добровольной основе. С октября 1918 по июнь 1920 гг. определились и получили свое развитие основные организационно-правовые формы рабоче-крестьянской милиции, были определены структура, функции милиции, права и обязанности ее сотрудников, порядок комплектования кадров. Для этого периода характерными особенностями были также: военизация милиции, участие в боевых действиях, оказание содействия действующей армии, ослабление работоспособности милицейских органов из-за неопределенности взаимоотношений с военными подразделениями. Служба в условиях военного положения увеличивала опасность для жизни милиционеров, а функциональная перегруженность Полоцкой уездной милиции отражалась на способности выполнять обязанности, соответствующие ее назначению.

ЛИТЕРАТУРА

1. Петриков, П.Т. Полоцк: Ист. очерк. АН БССР. Ин-т истории / П.Т. Петриков, М.О. Бич. – – 2-е изд., переработ. и доп. – Минск: Наука и техника, 1987. – 320 с.
2. Зональный государственный архив города Полоцка (далее – ЗГА в г. Полоцке). – Фонд 220. – Оп.1. – Д. 1.
3. Кароткі нарыс гісторы міліцыі Беларусі, 1917 – 1927 / склад.: І. Крэйнін, В. Власаў, В. Потэс. – Менск, 1927. – 227 с.
4. Постановление НКВД РСФСР, Наркомюста РСФСР от 13.10.1918 г. «Об организации Советской Рабоче-Крестьянской Милиции (Инструкция)» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://http://www.bestpravo.ru/sssr/eh-akty/j7b.htm. – Дата доступа: 10.04.2014 г.
5. ЗГА в г. Полоцке. – Фонд 220. – Оп. 1. – Д. 21.
6. ЗГА в г. Полоцке. – Фонд 220. – Оп. 1. – Д. 16.
7. История советской милиции: в 2 т. История МВД. 1917 – 1931 [Электронный ресурс] // Объединенная редакция МВД России. Б. д. URL: http://www.ormvd.ru/history/10011.
8. Витебская губерния 1917 – 1924 гг.: док. и материалы / сост.: Н.В. Воронова [и др.]; ред. кол.: В.И. Адамушка [и др.]. – Витебск: Витеб. обл. тип., 2012.
9. Декрет от 10 июня 1920 г. «О советско-крестьянской милиции» [Электронный ресурс].– Режим доступа: http://base.consultant.ru. Дата доступа: 10.04.2014 г.
10. Кур’яновіч, Ю.У. Міліцыя Беларусі ў 1917 – 1939 гг.: арганізацыйнае развіцце, дзейнасць па ахове грамадскага парадку і барацьбе са злачыннасцю / Ю.У. Кур’яновіч // Вестн. МГИРО. – 2013. – № 2. – С. 46 – 52.
11. Сумко, Е.В. Основные направления деятельности Полоцкой уездной милиции и ее обеспечение в 1921 – 1924 гг./ Е.В. Сумко, Н.В. Прокопенко // Вестн. Полоцк. гос. ун-та. – 2013. – № 9. – С. 116 – 121.
12. ЗГА г. Полоцка. – Фонд 220. – Оп. 1. – Д. 63.
13. ЗГА г. Полоцка. – Фонд 220. – Оп. 1. – Д. 156.

**УДК 94(=411.16)(476)**

# “ПРАШУ ПАСЯЛІЦЬ МЯНЕ Ў КРАШУТАХ”: ЯЎРЭІ-ЗЕМЛЯРОБЫ Ў ГІСТОРЫІ МАЁНТКА КРАШУТЫ ПОЛАЦКАГА ПАВЕТА

***магістр гіст. навук К.А. ТАЛЯРОНАК***
**Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск**

*Артыкул прысвечаны гісторыі стварэння яўрэйскага земляробчага пасялення на тэрыторыі дзяржаўнага маёнтка Крашуты Полацкага павета Віцебскай губерні ў 50-я гады XIX стагоддзя. Значная ўвага надаецца высвятленню прычын выбара яўрэямі менавіта гэтага месца. Асобны акцэнт*



polotsk.su

*робіцца на гісторыі яўрэйскіх сем'яў, якія не атрымалі дазвол на перасяленне для заняткаў земляробствам. На прыкладзе пасялення яўрэяў-земляробаў у маёнтку Крашуты аўтар прыходзіць да высновы аб наяўнасці спецыфічных рысаў яўрэйскай земляробчай каланізацыі на Беларусі ў другой палове XIX стагоддзя.*

Пры даследаванні аграрнай гісторыі яўрэйскага насельніцтва вёскі Крашуты вартымі ўвагі ў першую чаргу з'яўляюцца працы, прысвечаныя яўрэйскаму земляробству на Беларусі і даследаванні краязнаўчага накірунку. Гістарыяграфія гісторыі яўрэйскіх земляробчых калоній і пасяленняў на беларускіх землях другой паловы XIX стагоддзя прадстаўлена даволі вузкім колам прац. Самым значным даследаваннем па гэтай тэме працягвае заставацца праца расійскага дарэвалюцыйнага гісторыка В.Н. Нікіціна «Еврейские поселения Северо и Юго-Западных губерний (1835 - 1890)» [1]. Манаграфія прадстаўляе сабой не толькі дэталёвае апісанне калоній яўрэяў-земляробаў на Беларусі і паўднёвай Украіне, але і змяшчае значны статыстычны матэрыял па праблеме.

Важкае месца ў гістарыяграфіі пытання займае праца савецкага гісторыка С.Я. Баравога «Еврейская земледельческая колонизация в старой России : политика - идеология - хозяйство – быт» [2]. Аўтар разглядае пытанні яўрэйскага зямельнага ўладкавання ў Расійскай імперыі, гісторыю першых яўрэйскіх земляробчых калоній пачатку XIX стагоддзя ў Новаросіі. Аднак нягледзячы на выкарыстанне шырокага кола архіўных крыніц, гісторыя калоній на беларускіх землях падаецца вельмі фрагментарна.

Урыўкавыя звесткі аб стварэнні саслоўя яўрэяў-земляробаў на тэрыторыі беларускіх губерняў змяшчаюцца ў працах абагульняльнага характара рознага перыяду. Да такіх прац можна аднесці даследаванні Ю.І. Гесэна, А.І. Салжыніцына, Дж. Кліера і інш.

Шмат увагі яўрэйскай каланізацыі XIX стагоддзя ўдзяляецца сучаснымі украінскімі даследчыкамі. Сацыяльна-эканамічнае становішча яўрэяў-земляробаў, культурна-рэлігійнае жыццё, сістэму аховы здароўя ў земляробчх калоніях даследавалі Д.І. Яворніцкі, Н.В. Бачарова, С.І. Бобылева, У. Шчукін і інш. Аднак іх працы прысвечаны выключна яўрэйскім калоніям на тэрыторыі сучаснай паўднёвай Украіны и Крыма. Тым не менш, каштоўнасць гэтых прац у тым, што яны дазваляюць зрабіць сацыяльна-эканамічны аналіз становішча яўрэйскіх перасяленцаў, якія былі выхадцамі з беларускіх губерній, у большасці з Віцебскай і Магілёўскай.

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі вынікі даследавання па азначанай праблеме прадстаўлены ў артыкулах В.А. Сабалеўскай і У.А. Сосны [3, 4, 5].

Пошук краязнаўчых даследаванняў гісторыі вёскі Крашуты дазваляе ўзгадаць артыкулы беларускай паэтэсы З.І. Дудзюк і краязнаўцы Расонскага раёна В. Лебедзевай. Іх цікаўнасць скіроўваецца на пошук паходжання назвы вёскі, сюжэтаў мясцовых легендаў і паданняў [6, 7].

Тым не менш, невялікае кола навуковай літаратуры па тэме ў комплексе з архіўнымі дакументамі дазволілі асвяціць яўрэйскую гісторыю Крашут, а менавіта з'яўленне на тэрыторыі тагачаснага дзяржаўнага маёнтка першых яўрэяў і стварэнне тут яўрэйскага земляробчага пасялення ў 50-я гады XIX стагоддзя.

Асабліва важнай задачай даследавання стала спроба растлумачыць, чым было абумоўлена жаданне беларускіх яўрэяў пасяліцца менавіта ў гэтым дзяржаўным маёнтку, вызначыць прычыны папулярнасці дадзенага месца сярод яўрэяў, жадаючых быць прыпісанымі да саслоўя земляробаў на тэрыторыі беларускіх губерняў.

Сучасная вёска Крашуты адміністрацыйна належыць да Краснапольскага сельсавета Расонскага раёна Віцебскай вобласці. Геаграфічна знаходзіцца на Поўначы Беларусі.

Паходжанне назвы населенага пункта мае некалькі варыянтаў. Беларуская даследчыца З. Дудзюк, вывучаючы назвы беларускіх паселішчаў, прыйшла да высновы, што на тапаніміку Беларусі паклала след ведыйская міфалогія, з якой рэлігія далёкіх продкаў беларусаў мела некаторыя агульныя рысы. Яна ставіць назву вёскі Крашуты ў адзін рад з такімі назвамі як Крышычы, Крашын, Крышылавічы, Крашнева, Крашына, Крыштулі, мяркуючы, што продкі беларусаў "ведалі Крышну" [6].

Краязнаўца Расонскага раёну В. Лебедзева ў нарысах аб мясцовых легендах і падяннях выводзіць назву Крашуты з наступнай легенды: "Пагаворваюць, што ў гэтых месцах загінуў чалавек, які шукаў свайго шчасця разам з братамі пасля бітвы з ворагамі. Пабачыўшы ў сваім жыцці столькі болю, крыві, ён нават забыўся, што ёсць у свеце такія лагодныя прыгожыя мясціны, як гэта. І можа ад моцнай стомы, а можа ад усяго ўразіўшага тут, чалавек гэты паў на зямлю і памёр. Мабыць, гэта яго назаўсёды супакоеная дзівосамі краю душа шэптам чароту "краше тут…" спрабуе данясці да нас сэнс назвы вёскі Крашуты" [7].

Крашуты вядомыя яшчэ з XVI стагоддзя як вёска ў Полацкім ваяводстве Вялікага княства Літоўскага [8]. У XIX – пачатку XX стагоддзя знаходзілася на тэрыторыі Полацкага павета Віцебскай губерні.

PolotskSU

Нягледзячы на шматгадовую гісторыю, на генеральнай карце губерні падпалкоўніка Пядышэва 1820 года назва вёскі не фіксуецца. Дакладна вядома, што ў першай палове XIX стагоддзя яўрэяў на пастаянным жыхарстве ў вёсцы не было. Не ўдалося выявіць матэрыялы, якія б сведчылі аб высяленні яўрэйскага насельніцтва з Крашут згодна Палажэнню аб яўрэях 1804 года. Таму ёсць падставы меркаваць, што першымі яўрэямі, якія аселі ў вёсцы былі менавіта яўрэі-земляробы. Гэты працэс быў распачаты ў 50-я гады.

Трэба адзначыць, што першы заканадаўчы акт аб дазволе яўрэям мяжы аселасці ствараць яўрэйскія земляробчыя калоніі і пасяленні на тэрыторыі пяці беларускіх губерняў быў падпісаны яшчэ ў 1835 годзе. У параграфе 7 "Положения о евреях" ставілася мэта "устроить положение евреев на таких правилах, кои бы, открывая им свободный путь к снисканию безбедного содержания упражнениями в земледелии и промышленности и к постепенному образованию их юношества, в то же время преграждали им поводы к праздности и промыслам незаконным" [9; с. 361]. Згодна параграфу 29 "Евреи могут просить отвода им казённых земель с незанятых и оброчных по личному их желанию во всех местах, обозначенных для их оседлости" [9; с. 366].

У 1844 годзе было прынята дадатковае "Положение о евреях-земледельцах". Пасля прыняцця гэтага закона ў пачатку 1850-х гадоў у генерал-губернатарствах Беларусі значна ўзрастае колькасць прашэнняў ад мясцовага яўрэйства аб перасяленні іх для земляробчых заняткаў у межах губерній іх пастаяннай аселасці.

Сярод спраў Віцебскага губернскага камітэта аб яўрэях-земляробах відавочную большасць складаюць справы з прашэннямі асобных яўрэйскіх сем'яў пасяліцца ў дзяржаўным маёнтку Крашуты Полацкага павета. Гэта акалічнасць прымушае паставіць пытанне аб прычынах такой прывабнасці маёнтка для яўрэяў-земляробаў Віцебскай губерні.

Асобную папулярнасць сярод яўрэйскага насельніцтва казённы маёнтак Крашуты набывае ў другой палове XIX стагоддзя. На рост жадання ў яўрэйскім асяродку перайсці ў саслоўе земляробаў аказалі ўплыў некалькі фактараў. Фактычна магчымасць ствараць земляробчыя калоніі і пасяленні на тэрыторыі беларускіх губерняў з'явілася ў яўрэяў, як ужо адзначалася, пасля прыняцця Палажэння 1835 года. Да гэтага часу асноўным локусам стварэння яўрэйскіх земляробчых калоній былі паўднёвыя украінскія тэрыторыі Расійскай імперыі. Аднак цікавасць да маёнтка Крашуты пачынае ўзрастаць пасля Палажэння 1844 года. Ў перыяд з 1835 па 1844 год адзінкавых прашэнняў амаль не было, так як Палажэнне 1835 года уводзіла колькаснае абмежаванне для перасяленцаў. Для таго каб атрымаць дазвол заснаваць земляробчае пасяленне ці калонію ў беларускіх губернях патрабавалася наяўнасць не менш 25 яўрэйскіх сем'яў. Відавочна, што пасяленне такой колькасці людзей, вылучэнне для іх аднаразова значнага зямельнага надзелу было эканамічна вельмі складана ў тагачасных вясковых умовах малазямелля на тэрыторыі Беларусі. Палажэнне 1844 года дазваляла яўрэям "селиться в том количестве душ, сколько пожелают, хоть бы то было не более одной семьи" [10; с. 910].

У 1853 годзе ў канцэлярыю генерал-губернатара Віцебскага, Магілёўскага, Смаленскага было дакладзена аб 15 яўрэйскіх сем'ях, якія жадалі пасяліцца ў дзяржаўным маёнтку Крашуты. Гэта была даволі значная лічба, (для параўнання ў Гарадзецкім і Невельскім паветах прыходзілася па 5 семь'яў на тры населеныя пункты) [11; спр. 219]. У справаздачы за той жа год адзначалася, што ў Крашутах пасялілася 57 душ мужчынскага і 55 душ жаночага полу. Для земляробчай справы ім было адведзена 242,5 дзесяцін зямлі [11; спр. 219]. Дадзеныя лічбы адлюстроўваюць такі важны факт, што яўрэі перасяляліся ў Крашуты нават нягледзячы на недастатковы памер зямельнага надзелу, які быў зафіксаваны ў імперскім заканадаўстве. Яшчэ ў 1839 годзе асобным палажэннем быў уведзены мінімальны памер зямельнага надзелу для яўрэяў-земляробаў, якія сяліліся на казённых, памешчыцкіх і набытых ва ўласнасць землях. Для таго, каб яўрэйскі гаспадар быў прызнаны "трывала паселеным", ён павінен быў апрацоўваць не меньш за 5 дзесяцін на кожную рэвізскую душу мужчынскага полу [12; с. 4]. Аднак гэты закон на справе рэалізоўваўся вельмі рэдка, што было абумоўлена двумя асноўнымі прычынамі. Па-першае, надзяленне яўрэяў-земляробаў такой колькасцю зямлі на кожную душу мужчынскага полу выклікала незадавальненні сярод мясцовых сялян, што прыводзіла да росту дадатковай сацыяльнай напружанасці на вёсцы. Другая прычына – адсутнасць неабходнай колькасці свабодных дзесяцін зямлі ў свабодным зямельным фондзе.

Трэба адзначыць, што асобная цікавасць да маёнтка была сярод мясцовых памешчыкаў. У 1857 годзе памешчык Полацкага павета паручык Іван Шантыр хадатайстваваў аб аддачы яму ў арэнду трох надзелаў у Заборскім вясковым таварыстве, да якога адносіўся маёнтак Крашуты. Памешчык прапаноўваў выгадныя эканамічныя ўмовы арэнды: арэнда за "люстрационную цену" на 3 гады пры ўмове, што арэнда будзе выплочвацца вясковай управе за кожны год наперад [11; спр. 224].

Па справе памешчыка І. Шантыра Віцебскі губернскі камітэт аб яўрэях-земляробах пастанавіў аддаць яму ў арэнду 2 зямельныя надзелы і "...дать знать Полоцкому окружному начальнику, что в Заборском обществе, в имении Крашутах назначено для поселения евреев 15 участков, на коих должно быть водворено в настоящее время 13 еврейских семей" [11; спр. 224].

Аднак сярод яўрэяў былі і такія, каму адмаўлялі ў перасяленні. Трэба адзначыць, што для таго, каб быць запісаным у саслоўе яўрэяў-земляробаў, неабходна было прадставіць цэлы комплекс дакументаў аб колькасці нядоімак і запазычанасцяў, аб наяўнасці судовых спраў на членах яўрэйскай сям'і, выпіскі з рэвізскіх сказак. Мясцовыя ўлады вельмі ўважліва адносіліся да рэвізскіх сказак, што дазваляла зрабіць дэталёвы сацыяльны аналіз сям'і перасяленцаў. Даволі важную ролю ў гэтым выпадку адыгрываў паказчык колькасці душ мужчынскага полу, іх узрост і працаздольнасць. Яўрэйская сям'я, прэтэнэнт на перасяленне, павінна была складацца з дастатковай колькасці земляробаў, а менавіта не менш чым з двух работнікаў пры трох ці чатырох рэвізскіх душах мужчынскага полу ў кожнай сям'і [13; спр. 1]. Напрыклад, суражскі мешчанін Мендэль Віткін у 1853 годзе падаваў прашэнне аб пасяленні яго з сям'ёй у дзяржаўным маёнтку Крашуты для заняткаў сельскай гаспадаркай. Спачатку губернскія ўлады яму ў гэтым адмовілі, спасылаючыся на дадзеныя рэвізскай сказкі. Згодна прадстаўленаму дакументу, на думку чыноўнікаў, у сям'і Віткіна не хапала душ мужчынскага полу працоўнага ўзросту [11; спр. 91]. Акрамя таго, перапіска з мясцовай адміністрацыяй зацягнулася на 8 год, што было звычайнай справай у вырашэнні пытанняў такога кшталту. У выніку ў канцы 1860 года у Мендэля Віткіна спыталі аб жаданні перасяліцца на зямлю, на што ён адмовіўся, спасылаючыся на старасць і нядужае здароўе [11; спр. 91].

Трэба адзначыць, што важкай прычынай, для таго каб адмовіць яўрэю ў пераходзе да земляробства магла стаць заведзеная на яго ці членаў яго сям'і судовая справа. Дазвол на перасяленне яўрэйская сям'я атрымлівала толькі пасля прадстаўлення спраўкі аб адсутнасці заведзеных на яе судовых спраў. Гэта акалічнасць адыграла ключавую ролю ў гісторыі сям'і віцебскага мешчаніна яўрэя Нахіма Шалыты, які ў 1853 годзе падаў прашэнне аб далучэнні да саслоўя земляробаў і пасяленні ў дзяржаўным маёнтку Крашуты. Аднак у рапарце невельскага гараднічага адзначалася, што "витебский мещанин еврей Нахим Шалыта с семьёй находится под следствием по делу об отбитиии еврейского мальчика, взятого для сдачи в рекруты, и кроме того, член семьи его Шая Шалыта находится под судом по делу о фальшивом блинете пятидесятирублёвого достоинства" [11; спр. 93]. У выніку маёнтак Крашуты пазбавіўся яшчэ адной сямь'і яўрэйскіх перасяленцаў. Аднак для гісторыі гэтага маёнтка важным будзе сам факт таго, што ён быў вядомы віцебскім яўрэям, і мяшчане з губернскага горада Віцебска выказвалі жаданне перасяліцца ў маёнтак для пераходу ў саслоўе земляробаў.

У навуковай і мастацкай літаратуры вельмі сціпла падаецца апісанне сацыяльна-эканамічнага становішча яўрэйскіх земляробчых калоній і пасяленняў на тэрыторыі Беларусі. Аднак сярод архіўных спраў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ўдалося выявіць матэрыялы справаздачы аб яўрэях-земляробах у дзяржаўным маёнтку Крашуты.

Колькасць яўрэйскіх перасяленцаў у маёнтку нязначна мянялася на працягу 1850-х гадоў. У справаздачы за 1856 год значылася, што з 1852 года ў Крашутах было паселена 11 сем'яў (60 душ мужчынскага і 64 душы жаночага полу). 9 сем'яў атрымалі дапамогу ў 100 руб, 1 сям'я – 50 руб, 1 сям'я – 75 руб [11; спр. 219].

Кола заняткаў мужчынскага яўрэйскага насельніцтва маёнтка выходзіла па-за межы земляробчай справы. Напрыклад, яўрэй Элька Левін у летні час браў у арэнду кароў у памешчыка Юрэвіча, вёў за імі нагляд, прадаваў малако, масла, тварог. Некаторыя мужчыны займаліся развозам па суседніх вёсках і фальварках ялавічыны. Таксама яўрэйскія перасяленцы скуплівалі лён, хлеб, жывёлу, грыбы. Кожная яўрэйская сям'я апрацоўвала па 11,5 дзесяцін зямлі. Амаль у кожнай гаспадарцы былі 1 ці 2 кабылы, 1-3 каровы [11; спр. 219].

Наяўныя жылыя і гаспадарчыя пабудовы ў большасці сваёй былі збудаваныя з сасновага лесу, купленага ў сялян за грошы, якія выдзеліла яўрэям дзяржава у якасці матэрыяльнай дапамогі на перасяленне.

На рост прывабнасці маёнтка Крашуты ў яўрэйскім асяродку ўплывала некалькі фактараў. Перш за ўсё, наяўнасць свабодных надзелаў зямлі. Па-другое, эканамічнае становішча мясцовага сялянства. У справаздачы аб Крашутах адзначалася: "Крестьянство этих мест гораздо зажиточнее и по отдаленности от городов охотно покупают или берут в долг табак, соль и прочие" [11; спр. 219].

Аднак нягледзячы на даволі прывабнае знешняе апісанне яўрэйскага пасялення ў маёнтку Крашуты, у тэксце справаздачы адзначаецца, што яўрэі-земляробы мала займаюцца земляробствам, "в хозяйстве неопытны, да к тому же не имеют охоты, по прежнему своему обыкновению больше склонны к легким промыслам, для изыскания которых постоянно в отлучке без дозволения Сельского Начальства" [11; спр. 219]. Таксама падкрэсліваецца, што старэйшыя мужчыны ў большасці яўрэйскіх сем'яў

Polotsk.su

адсутнічаюць, і месца іх знаходжання невядома [11; спр. 219]. Чыноўнікі ад справаздачы да справаздачы дублююць тэкст аб адстутнасці яўрэйскіх гаспадароў, абвінавачваючы іх у імкненні ўхіліцца ад цяжкай земляробчай працы, нягледзячы на тое, што Палажэнне 1844 года дазваляла адлучацца з месцаў пасялення для гандлёвых спраў.

Чыноўнікі Віцебскага губернскага камітэта, якія займаліся абследаваннем яўрэйскіх земляробчых пасяленняў, у тым ліку Крашут, састаўлялі свае апісанні, супастаўляючы вобраз жыцця мясцовага сялянства з побытам яўрэяў-перасяленцаў. Скрозь прызму такога супастаўлення гаспадарчае жыццё яўрэйскіх сялян выглядала ненармальным супраць беларускага сялянскага побыту. Нягледзячы на тое, што яўрэйскія зямельныя надзелы апрацоўваліся і сельскагаспадарчыя заняткі займалі значнае месца ў сістэме гаспадарчай занятасці яўрэяў Крашут, водгукі чыноўнікаў былі адмоўныя. Для мясцовага чыноўніцтва не быў відавочным той факт, што яўрэі-земляробы станавіліся своеасаблівым прамежкавым класам з прыкметамі сялянскага і мяшчанскага саслоўяў. Спалучэнне сельска-гаспадарчай дзейнасці і спрадвечных “яўрэйскіх” заняткаў (гандаль і арэнда) на вёсцы стала новай эканамічнай альтэрнатывай ва ўмовах гарадской перанаселенасці і збяднення яўрэйскага насельніцтва.

ЛІТАРАТУРА

1. Никитин, В.Н. Еврейские поселения Северо и Юго-Западных губерний (1835-1890 гг) / В.Н. Никитин. – СПб., 1894. – 201 с.
2. Боровой С.Я. Еврейская земледельческая колонизация в старой России: Политика – идеология – хозяйство – быт. По архивным материалам. – М.: М.и С. Шабашниковы, 1928. – 200 с.
3. Соболевская О. Сельскохозяйственная деятельность евреев Белоруссии в XIX веке/ О. Соболевская // Евреи Беларуси / Израил. культур.-информ. центр, Открытый ун-т Израиля в Беларуси. [Вып ] 3-4: [Вып.] 3-4 – С. 26 – 34.
4. Соболевская, О.А. Повседневная жизнь евреев Беларуси в конце XVIII – первой половине XIX века : моногр. / О.А. Соболевская. – Гродно: ГрГУ, 2012. – 443 с.
5. Сосна У., Ходзін С. Яўрэі і земляробства ў Беларусі. // Беларусіка = Albaruthenika / Міжнар. асац. беларусістаў, Нац. навук.-асвет. цэнтр. ім. Ф. Скарыны. Кн. 4. Яўрэйска культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі; Вацлаў Ластоўскі – выдатны дзеяч беларускага адраджэння / Рэд.: В. Рагойша, Г. Цыхун, З. Шыбека. Мн.: Навука і Тэхніка, 1995. – С. 60 – 65.
6. Дудзюк З. Шляхам спрадвечнага слова, або прызнанне ў любові / Беларуская інтэрнэт-бібліятэка Камунікат [Электронны рэсурс]. http://kamunikat.fontel.net/www/knizki/mova/dudziuk/index.htm. Дата доступа: 10.04.2014.
7. Лебедзева В. Легенды і паданні зямелькі роднай / Республиканское общественное объединение «Белая Русь» [Электронны рэсурс]. Режим доступа: http://www.belayarus.by/projects/pero/676.html. Дата доступа: 10.04.2014.
8. Крашуты / Российская еврейская энциклопедия [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://www.rujen.ru/index.php/КРАШУТЫ. Дата доступа: 11.04.2014.
9. Леванда, В.О. Полный хронологический сборник и положений, касающихся евреев, от Уложения царя Алексея Михайловича до настоящего времени, от 1649 – 1873 г. / Сост. И изд. В.О. Леванда. – СПб., 1874 – 652 с.
10. Полное собрание законов Российской империи (далее – ВПСЗ). – II. Т.19, № 18562. – С. 910.
11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (далей – НГАБ у Мінску). – Ф. 2552. – Воп. 1. – Спр. 85, 91, 93, 219, 224.
12. ВПСЗ – II. Т. 14, № 11913. – С. 4.
13. НГАБ у Мінску. – Фонд 58. – Воп. 2. – Спр. 1.

PolotskSU

**УДК 94:262(474.5)**

## ИЗ РАННЕЙ ИСТОРИИ ЛИТОВСКОЙ МИТРОПОЛИИ

***д-р ист. наук, проф. К. ЦУКЕРМАН***
**Высшая практическая школа, Париж**

*Приведены результаты исследований по вопросам даты создания Литовской митрополии, личности и деятельности первого митрополита Литовского Феофила, изначального территориального определения Литовской митрополии.*

История Литовской митрополии Константинопольского патриархата не раз привлекала внимание ученых. В конце позапрошлого века ею занимались Г. Гельцер (Gelzer, 1892) и А.С. Павлов (1894), а не так давно она стала предметом рассмотрения в работе англо-литовского историка С. Роуэлла (Rowell 1994: 149 – 188). За столетие, что разделяет эти работы, накоплено немало ценных наблюдений, но также